**Журнал Белорусского государственного университета. История. 2018;4:28–35**
**Journal of the Belarusian State University. History. 2018;4:28–35**

*УДК 94(476)*

# ПРИНЦИП ТРУДА В БЕЛОРУССКОЙ НАЦИОНАЛЬНОЙ ИДЕЕ

***С. Н. ХОДИН*** [1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

В центре внимания – представления белорусов о справедливости. Определяется, в какой степени белорусским советским государством были учтены традиции, которые складывались веками и характеризовали белорусскую нацию в предшествующий период. Исследование проведено с использованием модернизационной парадигмы, которая позволяет утверждать, что изменения исторических условий не вызывают быстрых (почти автоматических) изменений в социальной жизни общества. Показано, что базисным элементом понимания справедливости у белорусского крестьянства являлся труд. Через отношение к нему формировалось понимание собственности, прежде всего собственности на землю, социальный статус человека. Сделан вывод о том, что принцип труда, который утвердился в ментальности белорусов как понимание справедливости, нашел свое отражение в высокой степени участия белорусских крестьян в коллективном труде в 1930-х гг.

***Ключевые слова:*** трансформационные процессы; модернизация; традиция; национальная идея; социальная психология крестьянства; аграрные отношения; ментальность; принцип работы; социальная справедливость.

# ПРЫНЦЫП ПРАЦЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ

***С. М. ХОДЗІН*** [1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

У цэнтры ўвагі – уяўленні беларусаў аб справядлівасці. Вызначаецца, у якой ступені беларускай савецкай дзяржавай былі ўлічаны традыцыі, што складваліся на працягу стагоддзяў і характарызавалі беларускую нацыю ў папярэдні перыяд. Даследаванне праведзена з выкарыстаннем мадэрнізацыйнай парадыгмы, якая дазваляе меркаваць, што змены гістарычных умоў не выклікаюць хуткіх (амаль аўтаматычных) змен у сацыяльным жыцці грамадства. Паказана, што базісным элементам разумення справядлівасці ў беларускага сялянства з'яўлялася праца. Праз адносіны да яе вызначалася разуменне ўласнасці, перш за ўсё ўласнасці на зямлю, сацыяльны статус чалавека. Зроблена выснова пра тое, што прынцып працы, які зацвердзіўся ў ментальнасці беларусаў як выяўленне справядлівасці, транслíраваўся і на новыя формы гаспадарання. Менавіта гэта прадвызначыла параўнальна высокія вынікі працы сельскагаспадарчых калектываў БССР 1930-х гг.

***Ключавыя словы:*** трансфармацыйныя працэсы; мадэрнізацыя; традыцыя; нацыянальная ідэя; сацыяльная псіхалогія сялянства; аграрныя адносіны; ментальнасць; прынцып працы; сацыяльная справядлівасць.

**Образец цитирования:**
Ходзін СМ. Прынцып працы ў беларускай нацыянальнай ідэі. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2018;4:28–35.

**For citation:**
Khodzin SM. Labour principle in the Belarusian national idea. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2018;4:28–35. Belarusian.

**Автор:**
***Сергей Николаевич Ходин*** – доктор исторических наук, доцент; проректор по учебной работе и интернационализации образования.

**Author:**
***Siarhei M. Khodzin***, doctor of science (history), docent; vice-rector for academic affairs and internationalization of education.
*skhodzin@mail.ru*

# LABOUR PRINCIPLE IN THE BELARUSIAN NATIONAL IDEA

***S. M. KHODZIN***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article focuses on the ideas of Belarusians about justice and the question of the extent to which the Belarusian Soviet state took into account the peculiarities and traditions that had been formed over the centuries and characterized the Belarusian nation in the previous period. The study was conducted using the modernization paradigm, which suggests that changes in historical conditions do not cause rapid (almost automatic) changes in the social life of society. The basic element of the understanding of justice among the Belarusian peasantry was labor. An understanding of property, above all, land ownership, the social status of a person, was formed through the attitude to work. The labor principle, which was established in the mentality of the Belarusians as an understanding of justice, was reflected in the high degree of participation of Belarusian peasants in collective labor in the 1930s.

***Key words:*** transformation processes; modernization; tradition; national idea; social psychology of the peasantry; agrarian relations; mentality; principle of operation; social justice.

Эту привычку к труду благородную
Нам бы не худо с тобой перенять...
*Н. А. Некрасов. Железная дорога.*

Стагоддзем падзей, якія адбываліся пад уздзеяннем Першага Усебеларускага з’езда, адзначаны 2018 і 2019 гг. Нацыя, якая мела глыбокія карані дзяржаўнасці, 100 гадоў таму распачынала непасрэднае дзяржаўнае будаўніцтва, і разгортвалася яно на савецкай аснове. Ці было гэта выпадковасцю, якое месца займае савецкі перыяд у гісторыі нашай дзяржаўнасці – гэтыя пытанні актуалізуюцца і ў навуковай думцы, і ў грамадскай свядомасці. Нараджэнне савецкай беларускай рэспублікі праходзіла ў складаных геапалітычных умовах. Той, хто звяртае ўвагу на супярэчлівы характар гэтага перыяду, вымушаны прызнаць, што папярэднія падзеі таксама маюць неадназначныя ацэнкі. У савецкі час былі створаны беларуская вышэйшая школа, навукова-даследчыя ўстановы, тэатр і кіно; беларусы ў страшнай вайне супольна з іншымі народамі адстаялі сваё права на існаванне; беларуская дзяржава стала сузаснавальніцай Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.

Гісторыкі маюць справу не з нейкай абстрактнай чалавечай істотай, а з асобай, якая жыве ў пэўны час у канкрэтнай мясцовасці, валодае ўласным жыццёвым і генетычна перанятым вопытам продкаў [1; 2]. Сучасныя формы эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця грамадства абапіраюцца на традыцыі, гістарычна сфарміраваныя ўяўленні пра справядлівасць і маральныя абавязкі. Трансфармацыйныя працэсы па-рознаму ўздзейнічаюць на чалавека ў залежнасці ад яго ўзросту, полу, узроўню адукацыі і культуры, прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы. У выніку вылучаецца множнасць мадэрнізацый, якая спараджае значную колькасць камбінацый, фарміруе сінергетычны эфект ці стварае новыя супярэчнасці [3].

Надзвычай цікавым уяўляецца пытанне пра тое, у якой ступені беларускай савецкай дзяржавай былі ўлічаны асаблівасці і традыцыі, што складваліся на працягу стагоддзяў і характарызавалі беларускую нацыю ў папярэдні перыяд. Такую характарыстыку можна лічыць больш дакладнай, калі яна ахоплівае пэўныя рысы прадстаўнікоў самай вялікай сацыяльнай групы (страты) беларускага грамадства, таму даследаванне сацыяльнай псіхалогіі сялянства і яе ўліку ў палітыцы беларускага савецкага кіраўніцтва бачыцца надзвычай важным і актуальным. Вёска да сярэдзіны XX ст. заставалася не толькі месцам, дзе жыла выключная большасць беларускага насельніцтва, але і цэнтрам захавання, трансляцыі традыцый нашага грамадства. Без вывучэння працэсаў трансфармацыі вёскі немагчыма вызначыць кірункі, тэндэнцыі і асаблівасці гістарычнага развіцця Беларусі. Роля аграрнага фактару з’яўляецца выключнай для ўмацавання стабільнасці дзяржавы, яе жыццяздольнасці і бяспекі. Аграрныя адносіны нельга акрэсліваць толькі як формы зямельнай уласнасці або землекарыстання. Іх неабходна асэнсоўваць у цеснай узаемасувязі з працоўнай этыкай, з улікам базавых каштоўнасцей (праца, справядлівасць), якія выяўляюцца ў культуры і ментальнасці беларусаў.

Да лета 1918 г., а ў шэрагу выпадкаў і пазней, значны ўплыў на аграрную палітыку савецкай Расіі, часткай якой становіцца падзеленая лініяй фронту Беларусь, мелі левыя эсэры. На пачатку снежня 1917 г. народным камісарам земляробства РСФСР стаў левы эсэр А. Л. Калягаеў. На месцах уплыў партыі эсэраў быў яшчэ большым. У гэты перыяд зямельныя аддзелы нярэдка прымалі рашэнні аб тым, што «ўсе хутары і адрубы як на надзельнай,

так і на купленай зямлі пераходзяць у абшчыны. Пры гэтым заможныя хутаране павінны былі перанесці свае пабудовы за свой кошт»[1] [4, с. 86]. Панаваў выключна «ўраўняльны фетышызм» [4, с. 95, 96]. Да 1920-х гг. расійскае сялянства вярнула ў абшчынную ўласнасць больш за 90 % зямлі. Як пісаў І. А. Кірылаў, «сялянства захапіла ўсю зямлю і ўраўняльна яе падзяліла. Мара цэлага шэрагу пакаленняў ажыццявілася, але вынікі гэтай усерасійскай дзялёжкі сталіся значна меншымі, чым чакалі многія» [4, с. 112].

Ва ўмовах ваенных дзеянняў ураўняльныя тэндэнцыі не атрымалі такога распаўсюджання на тэрыторыі Беларусі. Рэквізіцыі закранулі найперш сярэдняе і заможнае насельніцтва і садзейнічалі агульнаму збядненню насельніцтва. Ды і настроі вяскоўцаў тут былі іншыя, пра што сведчаць вынікі апытання, праведзеныя на мяжы 1920–1921 гг. ва ўсходняй частцы Беларусі [4, с. 112]. Спроба бальшавікоў захаваць буйныя гаспадаркі праз арганізацыю саўгасаў і камун сустрэла жорсткае супрацьдзеянне вёскі. Бальшавіцкае кіраўніцтва захавала памяць пра гэтыя падзеі, што ў далейшым істотна паўплывала на палітыку ў вёсцы. Пазней у спрэчцы з Д. Ф. Прышчэпавым першы сакратар ЦК КП(б)Б А. І. Крыніцкі заклікаў дзейнічаць больш рашуча ў ажыццяўленні патрабаванняў сялянства, «не чакаць, пакуль загрукочуць кранштацкія гарматы»[2].

Перадумовы для фарміравання нацыянальнай мадэлі мадэрнізацыі складваліся ў выніку вымушанай адаптацыі тэарэтыкамі бальшавіцкай партыі палажэнняў марксізму да рэчаіснасці краіны з пераважна сялянскім насельніцтвам у 1921–1923 гг. Кардынальны перагляд эканамічнай палітыкі, неабходнасць якога канстатавалася ў снежні 1920 г. на VIII Усерасійскім з’ездзе Саветаў, не быў рэалізаваны рашэннямі X з’езда РКП(б) і абмежаваўся пераходам да прадуктаабмену. Вядома, што першай і галоўнай рэзалюцыяй X з’езда РКП(б) стала рэзалюцыя «Аб адзінстве партыі». Вызначальным фактарам паступовага руху да рыначных адносін была пагроза новай сялянскай вайны. Пачатак новай эканамічнай палітыкі пад уздзеяннем рашэнняў IX Усерасійскага з’езда Саветаў (снежань 1921 г.) выявіўся найперш у беларускіх паветах, што да ўзбуйнення БССР уваходзілі ў склад РСФСР [1]. У шасці паветах адроджанай БССР ва ўмовах істотных разбурэнняў і пагранічнага становішча рэалізоўвалася іншая палітыка. Наркам земляробства БССР А. С. Славінскі лічыў памылкай ліквідацыю саўгасаў і калгасаў, створаных на аснове былых памешчыцкіх маёнткаў, маючы на ўвазе традыцыйнае размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў у беларускай вёсцы. Адмена надзвычайнага становішча, умацаванне дзяржаўных інстытутаў, падрыхтоўка да ўзбуйнення тэрыторыі БССР выклікалі неабходнасць выпрацоўкі асобнага зямельнага заканадаўства і пашыралі магчымасці для вызначэння альтэрнатыўных падыходаў да мадэрнізацыі [5; 6].

Мадэрнізацыйная і цывілізацыйная парадыгмы дазваляюць сцвярджаць міждысцыплінарную інтэграцыю, запатрабаваную гісторыяй як навукай пра чалавека. Мадэрнізацыя грамадства вызначаецца як працэс сістэмных змен і прадугледжвае дакладна сфармуляваныя мэты, што стаяць перад грамадствам, неабходнасць палітычнай волі і наяўнасць пэўнай групы людзей, якія гэтыя мэты вызначаюць і рэалізоўваюць. Важную ролю ў працэсах мадэрнізацыі адыгрываюць традыцыі, падрыхтаванасць гаспадарчай эліты да змен, наяўнасць распрацаванай навуковай канцэпцыі. У сярэдзіне 1920-х гг., з умацаваннем інстытутаў БССР, акрэсліўся фактар, які можна было б назваць фактарам дзяржаўнасці: інтарэсы рэспублікі як асобнага дзяржаўнага арганізма нярэдка не супадалі з інтарэсамі саюзнага цэнтра і прымушалі рэспубліканскія ўлады прымаць пад увагу найперш патрэбы Беларусі, што вызначаліся і ўласнымі інтарэсамі рэспубліканскай партыйна-гаспадарчай эліты, якая складвалася ў гэты перыяд.

На працягу 1920-х гг. у фарміраванні нацыянальнай палітыкі мадэрнізацыі істотная роля належала суб’ектыўнаму фактару асабістай пазіцыі наркамаў земляробства, найперш Д. Ф. Прышчэпава. Дзейнасць Народнага камісарыята земляробства БССР (далей – НКЗ БССР) разгортвалася з удзелам вядучых аграрнікаў і эканамістаў краіны (Г. І. Гарэцкі, А. А. Смоліч, І. А. Кіслякоў і інш.) на аснове тэарэтычных і практычных распрацовак, якія ажыццяўляліся пры створаных сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, даследчых станцыях і навукова-даследчым інстытуце. Найважнейшай рысай эканамічнай палітыкі ў Беларусі была апора на ўласныя рэсурсы. Абгрунтоўваючы неабходнасць максімальнага ўліку прыродна-геаграфічных умоў, А. А. Смоліч распрацаваў тэорыю рацыянальнага размяшчэння гаспадарчых комплексаў (эканом-геаграфічных ландшафтаў) [7].

Значнай праблемай для савецка-партыйнай улады стаў пошук форм сацыяльнай арганізацыі сялянства з мэтай пераходу да калектывізацыі. Павелічэнне колькасці партыйцаў з ліку сялян, а таксама рабочых у першым пакаленні садзейнічала пашырэнню меркаванняў пра тое, што менавіта абшчына ўтрымлівае парасткі новага сацыяльнага ладу. У сярэдзіне 1920-х гг. у СССР разгортваецца дыскусія пра ролю абшчыны ў трансфармацыі вёскі. Прыхільнікі калектыўнай

[1]Тут і далей пераклад наш. – *С. Х.*
[2]Стенограмма заседания Пленума ЦК КП(б)Б от 2–8 мая 1925 г. // Нац. арх. Респ. Беларусь. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 1992. Л. 91–97.

гаспадаркі меркавалі, што пры дыктатуры пралетарыяту абшчына, пазбаўленая ранейшых патрыярхальных рыс, стане найважнейшым элементам будучага сацыялістычнага грамадства [6, с. 24–28]. Супраць такіх сцверджанняў выступіў прафесар М. П. Макараў, які ў асобнай манаграфіі даследаваў аспекты эканамічнай эфектыўнасці калектыўных гаспадарак БССР у параўнанні з іншымі формамі землекарыстання [8].

У 1926 г. кіраўніцтва БССР (старшыня ЦВК А. Р. Чарвякоў і старшыня СНК І. А. Адамовіч), адстойваючы раўнапраўны статус Беларусі ў саюзнай супольнасці, не згадзілася з праектам «Агульныя асновы землекарыстання і землеўладкавання Саюза ССР», бо ён пакідаў на вырашэнне асобных саюзных рэспублік толькі выкананне зямельнага заканадаўства Саюза [9, с. 77–80]. Пра неабходнасць уліку спецыфікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі пры вызначэнні падаткаабкладання казаў на VIII Усебеларускім з’ездзе Саветаў наркам земляробства БССР Д. Ф. Прышчэпаў. Адстойваючы пазіцыі БССР, А. І. Крыніцкі (першы сакратар ЦК КП(б)Б у 1924–1927 гг.) у сувязі са стварэннем Заходняй вобласці пісаў І. Сталіну: «Беларусь – самастойная рэспубліка. Яна мае права мець упаўнаважанага пры Урадзе БССР, а не ў Смаленску»[3].

У савецка-партыйнай гістарыяграфіі менавіта Д. Ф. Прышчэпаў стаў увасабленнем радыкальных падыходаў да рэалізацыі новай эканамічнай палітыкі ў Беларусі. Аднак высокіх тэмпаў патрабавала партыйнае кіраўніцтва. На Пленуме ЦК КП(б)Б 3 мая 1925 г. А. І. Крыніцкі сцвярджаў, што ў гаспадарчай палітыцы і практыцы работы на вёсцы занадта шмат перажыткаў «ваеннага камунізму» і найпершай задачай «з’яўляецца цяпер рост накаплення ў вёсцы, узбагачэння дробнага гаспадара»[4]. У спрэчцы з А. І. Крыніцкім Д. Ф. Прышчэпаў падкрэсліваў, што, прызнаючы за селянінам права выбару, дзяржава не можа цалкам адмовіцца ад права заахвочваць тую ці іншую форму землекарыстання. Наконт пераацэнкі кааперацыі ён адзначаў: «Мы не пераацанілі. Мы недаацанілі. Зараз тэмпы кааперацыі даволі хуткія. Дзяржава ўклала вялікія сродкі, менавіта таму не трэба кідацца ў крайнасці… Кааперацыя не выключае павышэння таварнасці. Наадварот, гэтыя рэчы ўзаемазвязаныя»[5]. Кааперацыя, заснаваная на ўліку працы кожнага з яе ўдзельнікаў, на думку Д. Ф. Прышчэпава, павінна была вырастаць з ініцыятывы вяскоўцаў. Наркам земляробства адказваў партыйнаму кіраўніку па-сялянску: «Гэта не кармавая рэпа, якую вясною пасадзіш, а восенню яна ўжо вырасла. <…> На натуральна-спажывецкім фундаменце сялянскай гаспадаркі кааперацыя не будзе развівацца»[6]. Між тым у сярэдзіне 1920-х гг. узрастала спажыванне хлеба самімі сялянамі, павялічваліся выдаткі на корм жывёле. У 1928 г. Д. Ф. Прышчэпаў пісаў: «Такі ўзрост сельскай гаспадаркі, які пакуль што ідзе ў жывот, нас задаволіць не можа, таму што недахоп прадуктаў сельскагаспадарчай вытворчасці адаб’ецца на рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі»[7] [10, с. 54].

У 1924 і 1926 гг. адбываецца вяртанне ўсходніх беларускіх зямель у склад савецкай рэспублікі. Аб’яднальным фактарам для беларускіх тэрыторый з’яўлялася наяўнасць грамады («зямельнай грамады») як важнага сацыяльнага інстытута. Статыстычныя даныя за першыя гады савецкай улады адсутнічаюць, аднак звесткі аб праведзеных у пачатку 1920-х гг. нарадах савецкіх работнікаў паказваюць, што абшчыннага землекарыстання, і найперш перадзелаў зямлі, ва ўсходняй частцы Беларусі не было[8]. Аднак гэта не сведчыць пра адсутнасць у значнай часткі шматсямейнага насельніцтва ўраўняльных настрояў, якія аднавіліся падчас знаходжання ў складзе РСФСР, дзе абшчыннае землекарыстанне на працягу 1920-х гг. прызнавалася Зямельным кодэксам РСФСР. У падтрыманні сацыяльнай структуры традыцыйнага грамадства, ва ўзнікненні радыкальных ураўняльных і сацыялістычных рухаў заўсёды была заўважнай роля такой эмоцыі, як зайздрасць [11]. Рыначны тып паводзін ствараў шэраг магчымасцей і перспектыў, але для яго рэалізацыі неабходным было выкананне шэрагу ўмоў, як з боку дзяржавы, так і з боку селяніна.

Наркам земляробства Д. Ф. Прышчэпаў актыўна ўдзельнічаў у распрацоўцы зямельных кодэксаў БССР 1924 і 1925 гг. Вяртанне ўсходняй часткі Беларусі ў склад БССР, па яго меркаванні, акрэсліла задачу аднаўлення ранейшых традыцый землекарыстання. У 1927 г. у газеце «Звязда» ён пісаў: «Калі мы ў нас правядзём абшчынны парадак землекарыстання, мы адразу прыдушым гаспадарчую ініцыятыву сялянства, пры якой цяпер досыць шпарка праходзіць перабудова сельскай гаспадаркі… Прыклад некаторых губерняў РСФСР нам сведчыць аб тым, што яны доўгі час прасядзелі на абшчыне і, акрамя перадзелаў зямлі, нічому новаму не навучыліся… Дробнабуржуазную вёску і належны настрой сялянства мы ліквідуем не абшчын-

[3]Нац. арх. Респ. Беларусь. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 1500. Л. 279–280.
[4]Стенограмма заседания Пленума ЦК КП(б)Б от 2–8 мая 1925 г. // Нац. арх. Респ. Беларусь. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 1992. Л. 2–3.
[5]Там жа. Л. 91–97.
[6]Стенограмма X съезда КП(б)Б от 3–10 января 1927 г. 708 л. // Нац. арх. Респ. Беларусь. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 3083. Л. 550–551.
[7]Тут і далей цытаты прыводзяцца ў адпаведнасці з сучаснымі нормамі беларускай мовы. – *С. Х.*
[8]Протоколы [подлинные] 3-й сессии ЦИК СССР 3-го созыва. Февраль 1927 г. // Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. 3316. Оп. 3. Д. 266. Л. 24.

ным перадзелам зямель, а моцным развіццём сельскай гаспадаркі, яе пагалоўным вытворчым каапераваннем і індустрыялізацыяй» [12]. Разглядаючы захаванне абшчынных адносін на вёсцы як пэўны перажытак часу, Д. Ф. Прышчэпаў садзейнічаў землеўпарадкаванню і не ідэалізаваў ні хутарскую, ні калектыўную форму гаспадарання. У 1928 г. у серыі «Працы Беларускага навукова-даследчага Інстытута сельскае і лясное гаспадаркі» І. А. Кісьлякоў пры падтрымцы Д. Ф. Прышчэпава і Г. І. Гарэцкага выдаў сваё найбольш вядомае даследаванне «Пасёлкі (оптымум тэрыторыі і эфект землеўпарадкаваньня)» [13]. У гэтай працы аўтар дыскутуе з К. Я. Кіндзеевым аб вызначэнні тэрміна «пасёлак» і ўвогуле выказвае крытычнае стаўленне да расійскай універсітэцкай землеўпарадкавальнай навукі [13, с. 37–38].

З прычыны колькаснай перавагі сялянскага насельніцтва ўласныя падыходы да мадэрнізацыі вызначаюцца менавіта ў справе пераўтварэння беларускай вёскі. Асабліва заўважнымі сталі адрозненні ў галіне зямельнай палітыкі і зямельнага заканадаўства БССР і РСФСР. Станаўленне дзяржаўнасці прадвызначыла з'яўленне Зямельнага кодэкса БССР, які ствараўся з улікам назапашаных традыцый [14]. Рэалізуючы працоўны прынцып землекарыстання, беларускія кодэксы абмяжоўвалі магчымасці здаваць зямлю ў арэнду пэўнымі ўмовамі і тэрмінамі. У адрозненне ад расійскага заканадаўства, Зямельны кодэкс БССР не прадугледжваў прымусовы выдзел па патрабаванні меншасці, накіраваны галоўным чынам супраць абшчыны. Адмова ад ураўняльнага падыходу выяўлялася ва ўстанаўленні максімальных і мінімальных норм працоўнага землекарыстання, у захаванні і падтрымцы паказальных («культурных») гаспадарак, у адмаўленні ад абшчыны і вызначэнні функцый грамады. У якасці важных крыніц развіцця мадэрнізацыйных працэсаў разглядаліся людскія рэсурсы вёскі і працавітасць беларускага сялянства, якія маглі быць задзейнічаны пры ўмове стварэння спрыяльных умоў для эфектыўнага гаспадарання на зямлі.

Базісным элементам разумення справядлівасці ў беларускага сялянства з'яўлялася праца. Праз адносіны да яе вызначалася разуменне ўласнасці, перш за ўсё ўласнасці на зямлю, фарміраваўся сацыяльны статус чалавека. Менавіта гэты фактар ва ўмовах малаўрадлівай глебы, невысокай аддачы ад укладання сіл у сельскую гаспадарку, складаных прыродна-кліматычных умоў і спецыялізацыі на мяса-малочнай жывёлагадоўлі вызначаўся як найважнейшы. На сходах сялянства часцей за ўсё выступала салідарна, сцвярджаючы, што нельга лічыць кулакамі тых, хто стварыў свае набыткі за кошт уласнай працы на зямлі[9]. У сялянскім асяроддзі найбольш прыслухоўваліся да слова тых, хто меў поспех у сваёй гаспадарцы. На сходах беднаты многія выступалі досыць актыўна, а на агульных сходах многія маўчалі. Аднак партыйныя кіраўнікі адзначалі, што сітуацыя пачала паступова змяняцца, хоць тэмп гэтых змен не быў занадта хуткім. Найбольш актыўна выступалі жанчыны, ракурс параўнання сітуацыі на аснове паўсядзённых спраў выяўляўся ў такім выпадку найбольш яскрава. Так, сялянка з Полацкага раёна адзначала, што пазбаўленне «кулачкі» голасу для яе асабіста нічога не змяняе: «...будзе яна сядзець дома ў шаўковым плацці, сытая і ў цёплай кватэры, а я праседзела тут да пяці гадзін і прыйду дадому ў халодную хату, якую няма чым выпаліць, дзяцей і жывёлу пакарміць, так што мне да таго, што я маю голас, а сама галодная і халодная, лепш бы савецкая ўлада дапамагла»[10]. Заможнае сялянства займала больш актыўную пазіцыю на сходах, адстойваючы свае інтарэсы. Беднякі ж, наадварот, імкнуліся ўхіліцца ад работы, якая не аплачвалася.

Для разумення гісторыі фарміравання грамадзянскай супольнасці ва Усходняй Еўропе неабходна прымаць да ўвагі той факт, што калектыўная памяць пра зямлю (некалі даступную ўсім) мела вырашальнае значэнне ў фарміраванні звычаёвага права і, наадварот, у шэрагу выпадкаў – у непрыняцці грамадзянскага права ў заходнееўрапейскім яго разуменні. Ва ўсходнееўрапейскім гістарычным працэсе на працягу стагоддзяў фарміраваліся іншыя адносіны да ўласнасці. У лісце, адрасаваным П. А. Сталыпіну, Л. М. Талстой пісаў: «Несправядлівасць менавіта ў тым, што як не можа існаваць права аднаго чалавека валодаць іншым (рабства), так і не можа існаваць права аднаго, якога б ні было чалавека, багатага ці беднага, цара ці селяніна, валодаць зямлёю як уласнасцю. Зямля ёсць набытак усіх, і ўсе людзі маюць аднолькавае права карыстацца ёю» [15, с. 243]. У 1915 г. М. І. Туган-Бараноўскі падкрэсліваў: «Ідэі права на зямлю неабходна супрацьпаставіць як бясспрэчна найвышэйшую сацыяльную ідэю – ідэю права на зямлю (роўна як і на ўсе сродкі вытворчасці) зусім не кожнага асобнага грамадзяніна, а ўсяго грамадства ў сукупнасці» [16, с. 330]. Паводле М. В. Доўнар-Запольскага, «народнае разуменне працы і яе права на пазямельную ўласнасць рэзка адрозніваецца ад разумення ўласнасці, якое зацвердзілася ў культурных слаях» [17, с. 276]. Знакаміты беларускі гісторык падкрэсліваў: «Зямля – самы каштоўны прадмет для беларуса. Ва ўсіх яго шматлікіх абрадах, песнях, казках, якія вызначаюцца старажытнасцю поглядаў, адлюстроўваецца глыбокае пачуццё павагі да зямлі. Гэта зразумела, бо зямля шмат стагоддзяў карміла

[9]Бланки, отчеты, сведения. 1 января 1925 – 31 декабря 1925 // Нац. арх. Респ. Беларусь. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 2292. Л. 56, 58.
[10]Протоколы, сведения // Нац. арх. Респ. Беларусь. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 2766. Л. 12–13.

яго і корміць зараз. З уяўленнямі аб зямлі цесна звязана ўяўленне аб родзе. <...> Мы бачылі, як даражыць беларус сваім родам, і калі не мае сына, ён імкнецца зараней узяць прыёмыша, зяця-прымака, каб гэты працягваў яго род» [18, с. 43–44]. Зямля звязвалася ў свядомасці селяніна з родам, вечнасцю, працу на зямлі вясковец лічыў самай значнай. З прычыны розных умоў гаспадарання і перакрыжавання традыцый у Беларусі ў кірунку з усходу на захад усё мацней вызначалася імкненне да індывідуалізацыі, адмаўлення ад абшчынных форм гаспадарання, ураўняльнага падыходу і г. д. Разам з тым захоўвалася супадзенне ў асноўным падыходзе да зямлі як да агульнай каштоўнасці, якая павінна належаць усяму грамадству. Пры ўсіх разыходжаннях базавыя дакументы БНР і БССР выяўляюць адзінства ў адмаўленні прыватнай уласнасці на зямлю.

Істотную ролю грамады акрэсліваў М. В. Доўнар-Запольскі, паказваючы сялянскія ўзаемаадносіны. Нягледзячы на тое, што традыцыйныя рысы абшчынных адносін, уключаючы перадзелы зямлі як сведчанне ўраўняльнасці, паступова знікаюць, грамада ў Беларусі захоўвала значныя функцыі, акрэсленыя звычаёвым правам, што было ўлічана ў зямельных кодэксах як РСФСР, так і БССР. Але прынцып ураўняльнасці ў беларускім зямельным заканадаўстве сярэдзіны 1920-х гг. адсутнічаў. «Недастаткова мець права на зямлю па нараджэнні, – неабходна, каб гэта права падтрымлівалася працай», – адзначаў М. В. Доўнар-Запольскі і прыводзіў шмат сведчанняў таго, як зямлю, якая пуставала, грамада перадавала таму, хто яе апрацоўваў [18, с. 45–46]. Разуменне такога падыходу мы знаходзім у аграрных праграмах беларускіх партый.

У 1920-я гг. размеркаванне зямлі найчасцей ажыццяўлялася па фактычным землекарыстанні. Пэўнае адлюстраванне працоўнае карыстанне зямлёй знайшло і ў вызначэнні мінімальнай і максімальнай норм землекарыстання, якія залежалі ад наяўнасці рабочых рук у сям'і. Пры разліку максімальнай нормы меркавалася «пакінуць двару такую колькасць зямлі, каб ён мог апрацаваць яе сіламі сваёй сям'і пры ўмове, што гаспадарка будзе весціся не менш інтэнсіўна, чым дазваляюць натуральныя і эканамічныя ўмовы раёна». У аснову вылічэння максімальных норм былі пакладзены даныя рахункаводчых і агранамічных абследаванняў, атрыманых ад аддзела сельскай гаспадаркі і эканомікі НКЗ БССР. Для іх разліку былі вызначаны два месяцы – жнівень і верасень, калі на вядзенне гаспадаркі затрачвалася найбольш працы. У якасці асновы для разлікаў бралі сярэднюю сялянскую сям'ю (6 чалавек) у перакладзе на працоўныя каэфіцыенты: мужчыны і жанчыны звыш 16 гадоў – 1 працоўная адзінка; падлеткі (12–16 гадоў) – 0,5 адзінкі; дзеці да 12 гадоў – 0,25 адзінкі. Згодна з адзначанымі крытэрыямі, сям'я з шасці душ адпавядала 4 працоўным адзінкам. Пры разліках бралася пад увагу, што адна працоўная адзінка была занята ў хатняй гаспадарцы (гатаванне ежы і г. д.). Таксама ўлічваліся працоўныя нормы па раллі і сенакосе. Гаспадаркі, якія змяшчалі лішкі зямлі, падлягалі абрэзцы з мэтай забеспячэння зямлёй беззямельных і малазямельных сялян у адпаведнасці з мінімальнай нормай надзялення [18]. Дбайныя разлікі, зрэшты, не пазбавілі кіраўнікоў НКЗ БССР ад абвінавачанняў у скажэнні «класавай лініі». Малазямельныя шматдзетныя сем'і, відавочна, разлічвалі на магчымасць павелічэння землекарыстання пры размеркаванні па едаках. Малапісьменныя вяскоўцы выяўлялі сумненне ў справядлівасці такіх складаных падлікаў. Гэту незадаволенасць сялян у далейшым выкарысталі для абгрунтавання рэпрэсій супраць кіраўніцтва БССР.

Можна сцвярджаць, што прынцып працы, які склаўся ў ментальнасці беларусаў як выяўленне справядлівасці, трансліраваўся і на новыя формы гаспадарання. У калектыўных гаспадарках БССР ужо ў 1920-я гг. вызначыўся больш істотны адыход ад ураўняльнага прынцыпу размеркавання, чым у іншых савецкіх рэспубліках. Улік выдаткаванай працы пры аплаце практыкаваўся тут шырэй (22,5 % супраць 17,2 %). Размеркаванне ж даходаў «па едаках» і «па патрэбах» прымянялася значна радзей (11,7 і 6,0 % супраць 53,6 і 10,5 % адпаведна)[11]. Пераважную частку кіраўнікоў сельскагаспадарчых калектываў, створаных у 1920-я гг. (амаль выключна на былых памешчыцкіх землях) бяднейшым насельніцтвам, складалі серадняки. Сяляне лічылі, што той, хто не змог наладзіць працу ў сваёй прыватнай гаспадарцы, і ў абагуленай нічога не зможа палепшыць. «Камуністы для сялян на вёсцы не прыклад, бо не ўмеюць весці сваю гаспадарку», – сведчылі даследчыкі вёскі сярэдзіны 1920-х гг. [19, с. 11]. Вызначаючы ролю беларускага гаспадара, М. В. Доўнар-Запольскі заўважаў, што пры ўсёй сваёй выключнасці ён «можа і павінен рабіць толькі тое, што адпавядае агульным інтарэсам сям'і» [17, с. 11]. Гаспадар, згодна з сабранымі М. В. Доўнар-Запольскім матэрыяламі, мусіў быць прыкладам, каб навучаць іншых.

Акцэнт на прымусовых метадах калектывізацыі абумовіў паступовы адыход ад аплаты працы з улікам той маёмасці (паю), якая была ўнесена селянінам пры ўступленні ў калгас. Урэшце ў 1930-я гг. у калгасах серадняки апынуліся пад пагрозай рэпрэсій. Аднак пытанне матывацыі станавілася

[11]Рос. гос. арх. экономики. Ф. 4106. Оп. 14. Д. 39. Л. 36.

адным з самых істотных ва ўмовах малаўрадлівай глебы, невысокай аддачы ад укладання сіл у сельскую гаспадарку, складаных прыродна-кліматычных умоў і спецыялізацыі ў галіне тэхнічных культур раслінаводства і жывёлагадоўлі пры нізкай ступені механізацыі. Разгортвалася барацьба супраць «лайдакоў» у калгасах. Рэалізаваліся і ўдасканальваліся брыгадны прынцып арганізацыі працы, рахункаводства, падрыхтоўка спецыялістаў. Менавіта гэта прадвызначыла параўнальна высокія вынікі гаспадарання калектыўных форм ужо на працягу другой паловы 1930-х гг. Паводле звестак па 13 абласцях, краях і рэспубліках СССР, складзеных на аснове зводных вынікаў бюджэтаў калгаснікаў, адной калгаснай сям'ёй у 1935 г. у сярэднім было выпрацавана 462 працадні. У шэрагу рэгіёнаў – Ленінградскай і Днепрапятроўскай абласцях, Азова-Чарнаморскім і Заходнесібірскім краях – выпрацоўка вагалася паміж 500 і 550 працаднямі, а ў БССР перавышала 600 працадзён [20]. Можна меркаваць, што імклівыя тэмпы пасляваеннага развіцця БССР ва ўмовах нізкай механізацыі працы ў многім грунтаваліся на прытоку ў горад працавітай сялянскай моладзі.

Як адзначае І. А. Марзалюк, «любая нацыянальная ідэя – гэта адказ на тры фундаментальныя для кожнага народа пытанні: адкуль мы? хто мы? куды мы ідзём?» [21]. Для беларусаў сацыяльныя пытанні заўсёды суседнічалі з нацыянальнымі. Мы ішлі ў грамадзе як нацыя, якая сцвярджае, што ў аснове ацэнкі кожнага чалавека павінна быць праца. Праца на карысць сябе, сваёй сям'і, сваёй дзяржавы.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Ходин С. «Я из деревни». К вопросу о самосознании белорусов. *Беларуская думка.* 2014;1:83–89.
2. Ходзін СМ. Мадэрнізацыйныя працэсы ў Беларусі: трансфармацыя сялянскай псіхалогіі і традыцыйных сялянскіх інстытутаў (першая палова XX ст.). У: Каваленя АА, рэдактар. *Гістарычна-археалагічны зборнік.* Мінск: Беларуская навука; 2016. Выпуск 31. с. 72–78.
3. Ходзін СМ. Працэсы трансфармацыі беларускай вёскі ў кантэксце тэорыі мадэрнізацыі. *Беларускі гістарычны часопіс.* 2015;12:5–11.
4. Кириллов ИА. *Очерки землеустройства за три года революции (1918–1920 гг.).* Петроград: Издательство Народного комиссариата земледелия; 1922. 260 с.
5. Ходин СН. Аграрная политика в контексте традиций белорусской деревни: компаративные аспекты (первая четверть XX в.). *Исторический журнал: научные исследования.* 2015;6:727–736.
6. Ходин С. Кодекс наркома. Традиции и личность в процессах советской модернизации Беларуси (на примере 1920-х годов). *Беларуская думка.* 2015;12:24–28.
7. Смоліч А. *Сельскагаспадарчыя раёны Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў 1927–1928 гадах: папярэдняя схема і метадалагічныя ўвагі.* Мінск: [б. в.]; 1930. 138 с.
8. Макараў МП. *Спроба вывучэння эфектыўнасці форм землекарыстання ў БССР.* Мінск: [б. в.]; 1929. 112 с. (Працы Беларускага навукова-даследчага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі пры СНК БССР; том 7, выпуск 5).
9. Краткая объяснительная записка к проекту «Общие начала землепользования и землеустройства Союза Правительства Белорусской ССР». *На аграрном фронте.* 1926;10:77–80.
10. Прышчэпаў З. Задачы рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў сёлетнюю пасеўкампанію. *Советское строительство.* 1928;3–4:53–62.
11. Шек Г. *Зависть: теория социального поведения.* Москва: Ирисэн; 2008. 536 с.
12. Прышчэпаў З. Зямельная палітыка на далучанай тэрыторыі і нашы задачы (па Гомельшчыне). *Звязда.* 1927. 28–29 ліпеня.
13. Кіслякоў Я. *Пасёлкі (оптымум тэрыторыі і эфект землеўпарадкавання).* Мінск: Беларускі навуковы-даследчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі; 1928. 256 с.
14. *Ходзін С. М.* Этапы савецкай мадэрнізацыі і сацыякультурныя змены ў беларускай вёсцы (1921–1939). *Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права.* 2016;3:32–39.
15. Толстой ЛН. Письма 1907 г. В: Толстой ЛН. *Полное собрание сочинений. Том 7.* Москва: Художественная литература; 1956. с. 3–339.
16. Туган-Барановский МИ. *Социальные основы кооперации.* Москва: Экономика; 1989. 496 с.
17. Довнар-Запольский МВ. *Исследования и статьи. Том 1. Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность.* Киев: А. П. Сапунов; 1909. 488 с.
18. Довнар-Запольский М. Очерки обычного семейственного права крестьян Минской губернии. *Этнографическое обозрение.* 1897;2:1–16.
19. Большаков АМ. *Советская деревня (1917–1925 гг.): экономика и быт.* 2-е издание, значительно дополненное. Ленинград: Прибой; 1925. 264 с.
20. Хейнман С. Бюджет колхозника. *Правда.* 1936. 15 марта.
21. Марзалюк И. А хто там ідзе? Что такое белорусская национальная идея?.. *Советская Белоруссия.* 2014. 21 июня.

## References

1. Khodzin S. [«I am from the village». To a question about the identity of Belarusians]. *Belaruskaja dumka.* 2014;1:83–89. Russian.

2. Khodzin SM. Modernization processes in Belarus: the transformation of peasant psychology and traditional peasant institutions (first half of the XX century). In: Kavalenya AA, editor. *Gistarychna-arhealagichny zbornik* [Historical-archaeological collection]. Minsk: Belaruskaja navuka; 2016. Issue 31. p. 72–78.
3. Khodzin SM. The processes of the Belarusian village of transformation in the context of modernization theory. *Belaruski gistarychny chasopis* [Belarusian historical journal]. 2015;12:5–11. Belarusian.
4. Kirillov IA. *Ocherki zemleustroistva za tri goda revolyutsii (1918–1920 gg.)* [Land management essays for the period of three years of revolution (1918–1920)]. Petrograd: Editorial and Publishing Committee of the People's Committee for Agriculture; 1922. 260 p. Russian.
5. Khodzin SN. Agricultural policy in the context of the tradition of the Belarusian village: comparative aspects (first quarter of the XX century). *Istoricheskii zhurnal: nauchnye issledovaniya* [History journal: research]. 2015;6:727–736. Russian.
6. Khodzin S. [The Code of the People's Commissar: traditions and personality in the processes of the Soviet modernization of Belarus (on the example of the 1920s)]. *Belarusruskja dumka*. 2015;12:24–28. Russian.
7. Smolich A. *Sel'skagaspadarchyja rajony Belaruskaj Saveckaj Sacyjalistychnaj Rjespubliki w 1927–1928 gadah: papjarjednjaja shema i mjetadalagichnyja wvagi* [Agricultural areas of the Belarusian Soviet Socialist Republic in 1927–1928 years: the provisional scheme and methodological remarks]. Minsk: [publisher unknown]; 1930. 138 p. Belarusian.
8. Makarov MP. *Sproba vyvuchjen'nja jefektywnasci form zemlekarystannja w BSSR* [An attempt to study the effectiveness of land use in the BSSR]. Minsk: [publisher unknown]; 1929. 112 p. (Pracy Belaruskaga navukova-dasledchaga instytuta sel'skaj i ljasnoj gaspadarki pry SNK BSSR; volume 7, issue 5). Belarusian.
9. [A brief explanatory note to the project «Common beginnings of land use and land management of the Union of the Government of the Belarusian SSR»]. *Na agrarnom fronte*. 1926;10:77–80. Russian.
10. Prishchepov Z. [Tasks of reconstruction of agriculture during the current sowing campaign]. *Sovetskoe stroitel'stvo*. 1928;3–4:53–62. Belarusian.
11. Schoeck G. *Zavist': teoriya sotsial'nogo povedeniya* [Envy: a theory of social behavior]. Moscow: IRISEN; 2008. 536 p. Russian.
12. Prischepov S. [Land policy in the returned territory and our tasks (in the Gomel region)]. *Zvjazda*. 1927 July 28–29. Belarusian.
13. Kisljakow Y. *Pasjolki (optymum tjerytoryi i jefekt zemlewparadkavannja)* [Settlements Villages (optimum territory and the effect of land management)]. Minsk: Belarusian Research Institute of Agriculture and Forestry; 1928. 256 p. Belarusian.
14. Khodzin SM. The stages of the Soviet modernization and socio-cultural changes in the Belarusian village (1921–1939). *Vesnik BDU. Seryja 3, Gistoryja. Jekanomika. Prava.* 2016;3:32–39. Belarusian.
15. Tolstoy LN. [Letters 1907]. In: Tolstoy LN. *Polnoe sobranie sochinenii. Tom 7*. Moscow: Khudozhestvennaya literatura; 1956. p. 3–339. Russian.
16. Tugan-Baranovsky MI. *Sotsial'nye osnovy kooperatsii* [Social foundations of cooperation]. Moscow: Ekonomika; 1989. 496 p. Russian.
17. Dovnar-Zapolsky MV. *Issledovaniya i stat'i. Tom 1. Etnografiya i sotsiologiya, obychnoe pravo, statistika, belorusskaya pis'mennost'* [Studies and articles. Volume 1. Ethnography and sociology, customary law, statistics, Belarusian writing]. Kiev: A. P. Sapunov; 1909. 488 p. Russian.
18. Dovnar-Zapolsky M. [Essays on customary family law of the peasants of the Minsk province]. *Etnograficheskoe obozrenie* [Ethnographic review]. 1897;2:1–16. Russian.
19. Bolshakov AM. *Sovetskaya derevnya (1917–1925 gg.): ekonomika i byt* [Soviet village (1917–1925): economy and life]. 2nd edition, greatly enhanced. Leningrad: Priboi; 1925. 264 p. Russian.
20. Heinman S. [The budget of the collective farmer]. *Pravda*. 1936 March 15. Russian.
21. Marzalyuk I. [«A hto tam idze?» What is the Belarusian national idea?..]. *Sovetskaya Belarussiya*. 2014 June 21. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 25.09.2018.*
*Received by editorial board 25.09.2018.*